**Падгрупавы занатак па адукацыйнай вобласці "Падрыхтоўка да навучання грамаце" для выхаванцаў старшага дашкольнага ўзросту, якія навучаюцца па вучэбным плане спецыяльнай дашкольнай установы для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення**

**Тэма:** Развіццё ўмення рабіць гукавы аналіз 5-ці гукавых слоў (жолуд), падбіраць словы на пэўны гук.

**Праграмны змест**: развіваць уменне праводзіць гукавы аналіз слоў рознай гукавой будовы, рабіць гукавы аналіз 5-ці гукавых слоў (жолуд); практыкаваць ва ўменні даваць поўную характарыстыку кожнаму гуку; фарміраваць уяўленні пра заўсёды цвёрды гук [Ж]. Развіваць уменне вызначаць націскны склад і націскны галосны гук у слове. Развіваць уменне падбіраць і называць словы з пэўным гукам. Развіваць зрокавую і слыхавую ўвагу, памяць, моўныя здольнасці дзяцей, маўленчы і фанематычны слых, фанематычныя ўяўленні. Выхоўваць дакладнасць і адказнасць у выкананні заданняў, культуру паводзін.

**Абсталяванне:** дэманстратыўны малюнак "Жолуд", схема для аналіза 5-цігукавога слова, фішкі для абазначэння цвёрдых, мяккіх зычных, націскных і ненаціскных галосных, падручнік па адукацыйнай вобласці "Падрыхтоўка да навучання грамаце", раздатачны матэрыял: схемы для аналізу 5-цігукавых слоў, пеналы з фішкамі для абазначэння цвёрдых і мяккіх зычных, націскных і ненаціскных галосных, лялька Каралева гукаў і літар.

**Ход занятку**

1. Арганізацыйны момант. Стварэнне станоўчага эмацыянальнага настрою .

Педагог: Добры дзень, дзеці! Я рада бачыць вас, давайце прывітаемся з нашымі гасцямі, усміхнемся адно аднаму. Жадаю вам працаздольнасці і жадання набываць новыя веды. Сядайце на месца.

2. Асноўная частка.

Сюрпрызны момант. З'яўляецца Каралева гукаў і літар

Каралева:Добры дзень, дзеці! Я зноў прыйшла да вас, каб мы з вамі гулялі са словамі, расказвалі пра гукі, з якіх яны складаюцца. Згодны? (Адказы дзяцей) Тады пачынаем.

Каралева: Давайце паўтарым тое, што мы з вамі ўжо добра ведаем. Пакажыце фішкі, якія абазначаюць зычныя гукі. Якога яны колеру? (Дзеці паказваюць сінія фішкі і адказваюць на пытанне Каралевы).

Каралева: Так сінімі фішкамі мы абазначаем зычныя гукі. Адкажыце, якімі могуць быць зычныя гукі? (Адказы дзяцей). Пакажыце якой фішкай мы абазначаем цвёрды зычны гук? Якой фішкай абазначаем

мяккі зычны гук? (Дзеці называюць і  паказваюць адпаведныя фішкі: сіні прамавугольнік –цвёрды зычны і сінюю дужку –мяккі зычны).
Каралева: Назавіце і пакажыце, якой фішкай мы абазначаем галосныя гукі? (Дзеці адказваюць і паказваюць чырвоны кружочак)
Каралева: Нагадайце, якімі могуць быць галосныя гукі? (Адказы дзяцей)
Каралева:Так галосныя гукі могуць быць націскнымі і ненаціскнымі. Пакажыце, якой фішкай абазначаецца націскны галосны гук (Дзеці паказваюць адпаведную фішку).
Каралева: Пагуляем у гульню “Пакажы адпаведную фішку”, Я буду называць розныя гук, а вы паднімаць адпаведную фішку. (Прыкладны моўны матэрыял: м,мь,а, о, у, вь, л,бь, б.) (Дзеці слухаюць гукі і паднымаюць адпаведныя фішкі).
Каралева: Добра справіліся з заданнем, амаль не было памылак, малайцы. Сёння я прапаную пагуляць са словам. А вось з якім вы даведаецесь, калі адгадаеце маю загадку:

У драўляным клубочку,
Жыве маленькі дубочак.  (Адказы дзяцей).

Каралева: Так, сапраўды, гэта жолуд, насенне дуба. І сёння мы будзем разбіраць слова жолуд. (На дошку выстаўляю малюнак жолуда і  схему 5-ці гукавога слова).
Педагог: Прапаную паказаць Каралеве гукаў і літар, як мы ўмеем рабіць гукавы аналіз слова. Вазьміце і пакладзіце перад сабою схему слова. Вымавім выразна і палічым колькі гукаў у слове жолуд. (Дзеці выразна прамаўляюць слова і вызначаюць, што ў слове жолуд 5 гукаў).
(Разам з педагогам дзеці выразна прамаўляюць гукі ў  слове, вядуць указкай па схеме слова, вызначаюць кожны гук. З частковай дапамогай педагога даюць яму характарыстыку і ставяць адпаведную фішку на схему слова. Пасля гукавога аналізу слова вызначаюць націскны склад ў слове і націскны галосны гук).
Педагог: Колькі гукаў у слове жолуд? Колькі зычных гукаў? Назаві якія? Колькі галосных гукаў? Назаві якія? Назаві галосны гук? Ці ёсць у слове “жолуд” мяккія зычныя? (Адказы дзяцей)
Педагог: Так, сапраўды, у слове “жолуд”, усе зычныя цвёрдыя, мяккіх зычных у гэтым слове няма.
Педагог: Паслухайце ўважліва і запомніце. У беларускай мове гук  [Ж] заўсёды цвёрды, у яго няма мяккай пары, “малодшага брата”.
Педагог: Прапаную вам пагуляць у гульню”Жывыя гукі”. Хто які гук выбраў для сябе, хто якім гукам будзе? ( Дзеці прымаюць са схемы на дошцы гук, які яны выбралі для сябе і называюць яго).
Педагог: Паслухайце заданні для кожнага гука: гук [Ж] –робіць нахілы ўперад, гук [О] - выконвае хаду на месцы, гук [У] - робіць прысяданні.

(Дзеці выконваюць рухі ў адпаведнасці з тым, які гук яны выбралі для сябе).
Педагог: Гукі бегаюць, весяляцца, гукі ў словы становяцца. (Дзеці бегаюць па крузе. Потым становяцца адно каля аднаго ў залежнасці ад таго, якое месца займае гук у слове).
Педагог: Пакажыце свае фішкі, давайце прачытаем, якое слова ў нас атрымалася. (Дзеці з педагогам вымаўляюць па чарзе гукі, атрымліваецца слова "жолуд"). Малайцы, правільна называлі гукі і ў нас атрымалася слова "жолуд".
Педагог: Гукі на пісьме і пры чытанні мы абазначаем літарамі. Паглядзіце на дошку і назавіце літары, якія абазначаюць галосныя гукі. (Дзеці называюць галосныя гукі хорам, потым індывідуальна)
Педагог: Які першы галосны ў слове "жолуд". Адкрыйце пенал з галоснымі літарамі, знайдзіце літару О і замяніце фішку на схеме на гэту літару. (Дзеці выконваюць заданне).
Педагог: Які другі галосны ў слове "жолуд". Адкрыйце пенал з галоснымі літарамі, знайдзіце літару У і замяніце фішку на схеме на гэту літару. (Дзеці выконваюць заданне).
Педагог: Прачытаем слова "Жолуд", выразна вымаўляя ўсе гукі. (Дзеці чытаюць слова хорам і па-асобку).
Каралева: Малайцы, добра выканалі заданне, расказалі мне пра ўсе гукі ў слове "жолуд", нават паказалі і назвалі галосныя літары. А цяпер выканайце наступнае заданне. Я буду называць гукі, а вы будзеце іх па чарзе прымаць са схемы. Але перш давайце прачытаем слова яшчэ раз. (Дзеці вядуць указкай па схеме слова і выразна прамаўляюць усе гукі).
Каралева: Здыміце літару О. Назавіце і здыміце апошні гук у слове "жолуд". Здыміце літару У. Здыміце фішку якая абазначае гук [Л]. (Дзеці "Прачытваюць слова і выконваюць адпаведныя заданні)
Каралева: Які гук на схеме застаўся? (Адказы дзяцей)
Каралева: Так, сапраўды, у нас застаўся гук [Ж]. Успомніце, што нам неабходна пра яго памятаць? (Адказы дзяцей)
Каралева: Сапраўды, нам неабходна памятаць, што гук [Ж] у беларускай мове заўсёды цвёрды.
Каралева: А зараз, каб замацаваць нашы веды пра гук [Ж], прапаную вам назваць словы на гук [Ж]. Можаце карыстацца падказкаю падручніка. Паглядзіце на старонку і назавіце прадметы, якія пачынаюцца на гук [Ж]. Але будзьце ўважлівы на малюнке ёсць прадметы ў назвах якіх гэкага гука няма. (Дзеці перш самастойна, а потым з дапамогаю падручніка называюць прадметы у назвах якіх ёсць гук [Ж]).
3. Заключная частка.

Каралева:Добра справіліся з усімі маімі заданнямі. Успомніце якое слова мы сёння разбіралі? З якім незвачайным гукам мы сёння пазнаёміліся? Што мы павіння ведаць пра яго? Якія словы на гэты гук вы прыдумалі? Вымавіце гэты гук так, каб ён быў чутны ў сдове (Адказы дзяцей)

Педагог: Дзякуй вам за плённую працу. Да сустрэчы.